**ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2018 г.

**Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”**

**5 лістапада**

Бібліятэкары арганізавалі Дзень беларускай кнігі «Да роднай мовы крок зрабі». Падрыхтаваны літаратурны агляд «Дзень добры, кніжка беларуская!», на якім прадстаўлены навінкі беларускай літаратуры, кнігі беларускіх класікаў, вершы, казкі, апавяданні. Удзельнічаючы ў эстафеце беларускага маўлення «Гаворка беларуская», каманды «Вясёлка» і «Навальніца» з задавальненнем адгадвалі беларускія загадкі і рэбусы, спаборнічалі ў конкурсах «Перакладчыкі», «Я словам малюю Беларусь» і «Вось, які мы народ». Напрыканцы сустрэчы ўдзельнікі мерапрыемства атрымали салодкія пачастункі.

Гарадзецкі філіял, 28 чал.

**5 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшоў юбілейны вечар-памяць «Пясняр Палесся», прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння вядомага ўкраінскага паэта, нашага земляка Дзмітрыя Фалькоўскага. Мерапрыемства, арганізаванае сумесна з грамадскім аб’яднаннем «Украінскі навукова-педагагічны саюз «Берагіня», праходзіла на беларускай і ўкраінскай мовах. Перад гасцямі вечара выступілі: консул консульства Украіны ў г. Брэсце А. Н. Дзізэнка, старшыня грамадскага аб’яднання «Украінскі навукова-педагагічны саюз «Берагіня» В. С. Місіюк, знаўцы творчасці юбіляра Ю. Другак і Я. Берлажэцкі. Увазе прысутных прадстаўлены: відэапрэзентацыя «Сын двух народаў», выстава-юбіляр «Я став співцем свого Полісся», прэзентацыя навуковай работы вучняў СШ № 2 г. Кобрына, якая прысвечана Д. Н. Фалькоўскаму. Гучалі вершы, песні на вершы Д. Н. Фалькоўскага на ўкраінскай, беларускай мовах. Старшыня грамадскага аб’яднання «Украінскі навукова-педагагічны саюз «Берагіня» падарыў бібліятэцы кнігі.

*(Кобрынскі веснік, 2018, 10 лістапада; Кобрин-информ, 2018, 8 ноября).*

ЦРБ, 72 чал.

**17 лістапада**

З нагоды святкавання 70-годдзя з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц у бібліятэцы прайшло выступленне літаратурна-паэтычнай групы «Крыніца» «Гарчынка песні недапетай…». Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «Ластаўка беларускай паэзіі…», дэманстравалася прэзентацыя «Пражыла жыццѐ, як птушка…», чыталіся вершы.

Батчынская ПБ, 23 чал.

**25 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшло выступленне літаратурна-паэтычнай групы «Рытм» «А ўсё таму, што родам з лістападу…», прысвечанае 70-годдзю з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц. Бібліятэкары пазнаёмілі вучняў СШ №8 г. Кобрына з біяграфіяй Яўгеніі Іосіфаўны, расказалі пра яе творчасць. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Пачынаецца ўсё з любові…».

ЦРБ, 56 чал.

**26 лістапада**

У час правядзення краязнаўчага падарожжа «Хочаш ведаць свой край - у бібліятэку завітай» бібліятэкар расказала аб мінулым і сучасным нашай краіны, пазнаёміла з экспанатамі «Кутка старажытнага побыту». Юныя карыстальнікі актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Мая Беларусь», «Закончы беларускую прымаўку», «Перакладзі слова на беларускую мову» і ўдзельнічалі ў конкурсе «Чытаем вершы беларускіх паэтаў». У канцы мерапрыемства для дзецей быў арганізаваны салодкі стол.

Восаўская ПБ, 25 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках абласной прафілактычнай акцыі “Карысныя канікулы”

**1 лістапада**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правялі квэст-гульню «Таямніцы восеньскай палянкі». Каб знайсці скарб, камандам давялося прайсці выпрабаванні на станцыях: «Жывёлы», «Грыбы», «Травы», «Ягады», «Дрэвы», «Эстафетная», «Музычная». Пры выкананні заданняў удзельнікі звярталіся за дапамогай да даведкавых выданняў. Перашкоды ў іх выкананні дзецям стварала Баба Яга. Скончылася мерапрыемства танцавальнай праграмай.

Залеская ПБ, 25 чал.

**2 лістапада**

На краязнаўчым калейдаскопе «Уроки Деда Природоведа» юныя карыстальнікі знаёміліся з серыяй кніг Г. В. Трафімавай, разгадвалі загадкі, складалі прыказкі, збіралі малюнкі па фрагментах, адгадвалі прадметы, што апісваюцца бібліятэкарам. За актыўны ўдзел дзеці ўзнагароджаны дыпломамі і салодкімі прызамі. Завяршэннем праграмы стала дыскатэка.

Кіселявецкая ПБ, 18 чал.

**2 лістапада**

Для дзяцей школьнага лагера бібліятэкар правяла размову ля кніжнай паліцы «Милосердность на книжной полке». Разам з прысутнымі пачытала ўрыўкі з лепшых твораў дзіцячай мастацкай літаратуры аб міласэрнасці, дабрыні і спаўчуванні, прагледзелі мультымедыйную прэзентацыю «Милосердность – наш девиз». Навучэнцы пазнаёміліся з лепшымі творамі дзіцячых пісьменнікаў аб міласэрнасці, паўдзельнічалі у віктарынах і конкурсах. Самыя актыўныя ўзнагароджаны салодкімі прызамі.

Балоцкая ПБ, 23 чал.

**5 лістапада**

У час правядзення пазнавальна-забаўляльнай праграмы «Познавайте мир, учитесь, думайте!» бібліятэкар правяла бібліяграфічны агляд тэматычнай літаратуры фонда. Дзеці падрыхтавалі кароткія паведамленні пра восень і яе азнакі, паўдзельнічалі у конкурсах «Съедобные грибы», «Животные Беларуси», «Птицы Беларуси», у конкурсе малюнкаў. Зацікавіліся юныя карыстальнікі і «Чырвонай кнігай Рэспублікі Беларусь». Пад канец мерапрыемства дзеці выбралі для чытання дома кнігу ці часопіс.

Верхалеская ПБ, 25 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Всемирный день некурения»

**14 лістапада**

Бібліятэкарам арганізаваны дыялог-заклік «Даже не пробуй» для навучэнцаў сярэдніх классаў. Дзеці даведаліся аб згубных звычках, які доўгі перыяд патрабуецца чалавеку для ачышчэння арганізма ад нікаціну і іншых шкодных рэчываў, згадалі аб актуальнасці праблемы тытунекурэння. З вялікай цікавасцю яны ўдзельнічалі ў гульні «Брэйн-рынг». У завяршэнні мерапрыемства праведзены агляд у кніжнай выставы «Прычына адна - наступстваў мноства».

Буховіцкая ПБ, 21 чал.

**25 лістапада**

На гадзіну карысных парад «Курэнне – зло! » сабраліся навучэнцы сярэдніх і старэйшых класаў Шамятоўскай СШ. Увазе прысутных прадстаўлена кніжная выстава «Сбереги себя для жизни», прапанаваны спіс выданняў па здароваму ладу жыцця, праведзены конкурсы «Збяры пасловіцу і растлумач яе сэнс», «Глаза – зеркало души» , «В здоровом теле – здоровый дух», «Ослепительная улыбка», гульня «Это я, это я, это все мои друзья» і інш. На працягу мерапрыемства выкарыстоўваліся камп’ютарныя слайды па тэматыцы здаровага ладу жыцця.

Шамятоўская ПБ, 26 чал.

**27 лістапада**

Гасцямі урока здароўя «Курение или здоровье? Выбирайте сами!» сталі навучэнцы старэйшых класаў СШ №3 г. Кобрына. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным аб таксічным уздзеянні кампанентаў тытунёвага дыму на здароўе чалавека, пра захворванні, звязаныя з курэннем. Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй «Тихий убийца».

ЦРБ, 52 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**22 лістапада**

У час правядзення пазнавальнай праграмы «Гиннес. Мировые рекорды», прысвячанай Сусветнаму дню Кнігі рэкордаў Гінэса, бібліятэкары расказалі падапечным дзеннага знаходжання ТЦСАН пра самую папулярную

кнігу ў гісторыі выдавецкай справы – «Книгу рекордов Гиннеса», аб яе гісторыі, аб сусветных рэкордах у розных галінах.

ЦРБ, 18 чал.

**23 лістапада**

На творчай сустрэчы з дзіцячым пісьменнікам Валерыем Квілорыя «Детство, которое всегда с тобой» хлопчыкі і дзяўчынкі пазнаёміліся з сапраўдным пісьменнікам і яго творамі. Дзеці ўважліва слухалі пісьменніка, задавалі пытанні, на якія Валерый Тамазавіч з задавальненнем адпавядаў. Валерый Квілорыя не толькі пазнаёміў са сваёй творчасцю, адказаў на іх пытанні, але і прадэманстраваў ім кнігі іншых дзіцячых аўтараў, якія ён выдае. Прадстаўлена кніжная выстава «Весёлые книги Валерия Квилория».

Дзіцячы філіял, 75 чал.

**26 лістапада**

У бібліятэцы прайшоў Дзень творчага планавання «От идеи к плану действий», удзельнікамі якога сталі супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна. Пачалося навучанне кадраў з урока-трэнінгу «Совершенствование владения белорусским языком как условие повышения качества библиотечной работы», які правяла настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пракаповіч Н. Н. Метадысты аддзела бібліятэчнага маркетынгу прадставілі электронныя прэзентацыі ў дапамогу састаўленню планаў на 2019 год. Спецыялісты цэнтральнай бібліятэкі пазнаёмілі з патрабаваннямі па планаванню. Шэсць пачынаючых бібліятэкараў прынялі ўдзел у практыкуме «Учимся мастерству планирования».

ЦРБ, 52 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81